**Ганна САВІЧ**

## Парада

*Так многа хочацца зрабіць,*
*Дзясятак сёмы размяняла.*
*— Яшчэ каб трышачку пажыць,—*
*Матуля так казала.*

*Ужо маем усё, унукі ёсць,*
*Пакой шукаем у гэтым.*
*Вось яно — шчасце і жыццё*
*Найлепшае ў свеце!*

*Усмешкі шчырыя лавіць,*
*Што з вуснаў іх зыходзяць,*
*Парадай добрай дзецям быць,*
*Каб ім жылося ў згодзе.*

*Пабраўшыся, каб сваіх рук*
*У жыцці не расчаплялі,*
*А каб вясёлы быў унук,*
*Шчэ й брацiка шукалі.*

*З краін далёкіх прынясе*
*Ім немаўлятка бусел,*
*Ці ў лісце знойдуць, што расце*
*На градачцы капустнай.*

*Унучку пасля разпавядуць,*
*Дзе брацiка шукалі.*
*Галоўнае, каб усе ў сям'і*
*Пустот не адчувалі.*

*І за вялікім каб сталом*
*Сядзелі бацька, маці,*
*І каша смачная гуртом,*
*Сястрычкі дзве і брацік.*